***Алена Фірыновіч,***
***аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі***

# АДНОСІНЫ КАТАЛІЦКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ДА КАНФЕСІЙНАЙ ПАЛІТЫКІ ЎРАДУ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў 60-Я ГГ. XIX СТ.

Проаналізовано відносини католицького духовенства і віруючих західних губерній Російської імперії та заходи конфесійної політики уряду під час і після повстання 1863–1864 рр. Досліджено їхню реакцію на закриття костелів, монастирів і навернення місцевого населення у православ'я.
***Ключові слова***: *повстання 1863–1864 рр., конфесійна політика, Російська імперія, римо-католицьке духовенство, віруючі.*

Другая палова XIX ст. у гісторыі Расійскай імперыі – перыяд інтэнсіўных змяненняў у сацыяльна-эканамічным, палітычным, грамадскім і культурна-духоўным жыцці краіны. Трансфармацыя асноў культурна-духоўнай сферы ў пэўнай ступені звязана з рэлігійнай сітуацыяй у дзяржаве, а менавіта з канфесійнай палітыкай ураду ў дзевяці заходніх губернях Расійскай імперыі (Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай, Падольскай). Шматканфесійнасць насельніцтва адзначанай тэрыторыі заўсёды вымагала ад кіраўніцтва надзвычай прадуманага, мэтанакіраванага канфесійнага палітычнага курсу. У 60-я гг. XIX ст. выключным момантам у ідэалагічным абгрунтаванні яго рэалізацыі стала паўстанне 1863–1864 гг. Палітычная арыентацыя рымска-каталіцкага духавенства і яго ўдзел у падзеях 1863–1864 гг. з мэтай аднаўлення Рэчы Паспалітай, дзе каталіцтва было пануючай рэлігіяй, абумовілі сістэму рэпрэсіўных мер і абмежаванняў адносна Рымска-каталіцкай царквы, якая стала разглядацца ў якасці аднаго з галоўных ворагаў расійскага ўраду. Афіцыйную думку па гэтаму пытанню яскрава дэманструюць выказванні відавочцаў і летапісцаў рэалій 1863–1864 гг. Так, А. Мілавідаў адзначаў: «Объединяя в себе католицизм, как силу духовную, и полонизм, как силу политическую, латино-польское ксендзовство смогло сделаться руководителем панства и [...] постоянным действующим лицом революции»[1] . П. Бранцаў падкрэсліваў, што прызнакам рэвалюцыйнага руху было «поднятие [...] значения костелов» и «унижения православных церквей»[2] . Такім чынам, асноўныя намаганні дзяржаўнага кіраўніцтва былі сканцэнтраваны на арганізацыі мерапрыемстваў па змяншэнню значэння і ролі каталіцтва і ўзвышэнню праваслаўя у «Паўночна-Заходнім і Паўднёва-Заходнім Краі».

Канфесійная палітыка ўраду Расійскай імперыі ў 60-я гг. XIX ст. не раз станавілася аб'ектам навуковых даследаванняў. Першымі на адносіны паміж дзяржавай і рымска-каталіцкай царквой падчас паўстання 1863–1864 гг. і пасля яго падаўлення звярнулі сваю ўвагу расійскія афіцыйныя гісторыкі[3] . Ацэнка іх ажыццяўлялася ў межах агульнадзяржаўнай ідэалогіі і шавіністычнай ідэі «истинно русских начал западных районов». Тыповымі былі сцвярджэнні, што

«край тот искони русский, и что ополячили его мы сами, и что опыт 1831 г. нам не послужил в пользу и что теперь надо решительно подавить мятеж и уничтожить крамолу и восстановить русскую народность и православие»[4]. У выніку ўсе рэпрэсіўныя меры і наступствы на каталіцтва ўспрымаліся як адзіннае правільнае рашэнне. Савецкая гістарыяграфія з яе атэістычнымі прыярытэтамі ігнаравала адзначаны аспект. Аднак у некаторых працах праходзілі мазаічныя, адрывістыя звесткі пра ўдзел рымска-каталіцкага духавенства ў паўстанні і рэпрэсіях, якія іх напаткалі[5]. Актыўна тэма пачала распрацоўвацца з 1990-х гг. беларускімі[6], польскімі[7], украінскімі[8], расійскімі[9] і літоўскімі навукоўцамі[10]. Абсалютная большасць з іх прыходзіць да высновы, што канфесійная палітыка стала важнейшым інструментам русіфікацыі ўсіх тэрыторый, далучаных да Расійскай імперыі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Па меркаваннях прадстаўнікоў украінскай гістарычнай думкі, 1863 г. паклаў пачатак «витіснення цієї конфесії на периферію суспільного розвітку»[11]. У навуковай літаратуры вельмі падрабязна раскрыты пытанні арганізацыйна-распарадчай сістэмы абмежавальных мерапрыемстваў у дзейнасці каталіцкага кліра, вылучаны нарматыўная база адзначанай палітычнай лініі і механізмы яе ажыццяўлення, прааналізаваны канфесійныя змяненні з прыцягненнем вялікай колькасці статыстычных дадзеных і г. д. Меньш увагі ўдзелена высвятленню стаўлення мясцовага насельніцтва да ўрадавай палітыкі. Звяртаючыся да высноў сучаснай беларускай даследчыцы В. Яноўскай, што «галоўнымі дзеючымі асобамі ў паўстанні 1863–1864 гг. былі дзве хрысціянскія канфесіі – каталіцкая і праваслаўная, іх вернікі і святчэннаслужыцелі»[12], паспрабуем больш падрабязна разгледзець рэакцыю і паводзіны на вызначаны палітычны курс прадстаўнікоў каталіцкага веравызнання, як духоўных, так і свецкіх асоб. А, паколькі тагачасная канфесійная палітыка прадстаўляла сабой складаны комплекс крокаў на агульнадзяржаўным узроўні, засяродзім сваю ўвагу на двух мерапрыемствах, якія найбольш цесна аб'ядноўвалі духавенства і вернікаў – закрыццё рымска-каталіцкіх духоўных установаў і перавод у праваслаўе так званых «совратившихся».

Ліквідацыя каталіцкіх касцёлаў, асабістых капліц і кляштараў, перабудова іх у праваслаўныя храмы адбывалася адносна лёгка. Асаблівай аргументацыі для яе ажыццяўлення ўладам не патрабавалася, аднак сустракаліся выпадкі з ужываннем абгрунтавання лагічнасці дзеяння. Найбольш пашыранымі падставамі таму служылі: непасрэдны ўдзел у падзеях 1863–1864 гг.; западазронасць у палітычнай недобранадзейнасці плябана, манаха або ўладальніка зямлі, дзе знаходзілася пабудова; яе дрэнны стан ці невялікая колькасць вернікаў з абавязковым улікам іх сацыяльнага паходжання, якія належылі гэтаму прыходу. Дастаткова складана ўстанавіць на сённяшні дзень наколькі гэтыя падставы былі праўдападобнымі. Так, касцёл у м. Глуск Бабруйскага павету быў зачынены, згодна звесткам калежскага саветніка Скуратава, па некалькіх прычынах: «числится в приходе Глусского Костела 1500 душ обоего пола, но прихожане эти рассеяны по приходу на расстоянии во все стороны до 50 верст от Глусска и состоят исключительно из окрестных помещиков с их семейством [...] Крестьян не принадлежит. [...] Ксендз Тамошевич за противодействие

Православию и ослушание Правительству [...] выслан на жительство в Олонецкую губернию»[13]. Каменная ж капліца ў маёнтку Багушэвічы Ігуменскага павету была перададзена ў праваслаўнае ведамства за ўдзел яе ўладальніка Баляслава Свентаржыцкага ў паўстанні. Для яе перабудовы быў распрацаваны спецыяльны праект, які каштаваў ураду 770 рублёў 3,5 капейкі. У капліцы змайстравалі іканастас святога Данііла ў гонар мясцовага праваслаўнага святара Данііла Канапасевіча, павешанага паўстанцамі 13 мая 1863 г.[14] Малчадскі рымска-каталіцкі касцёл Брэсцкага павету зачынілі, спасылаючыся на тое, што «костельное здание до того ветхо, что отправление в нем богослужения сопряжено с опасением, прихожане же его, числом в 198 лиц, расположенные среди Православного населения, могут быть причислены к Дзенцюльскому костелу». Касцёлу належылі цудоўныя званы, за якія вяліся спрэчкі паміж святарамі Люшнеўскай і Малчадскай цэркваў. Яны былі скончаны толькі ў 1867 г., калі духоўныя ўлады падзялілі іх пароўну, па два кожнай з цэркваў[15].

Адкрытага масавага супраціўлення закрыццё касцёлаў і кляштараў не выклікала ні сярод кліра, ні сярод вернікаў каталіцкага веравызнання. Але ў архіўных дакументах і мемуарнай літаратуры маюцца звесткі пра паводзіны ніжэйшага духавенства. Нярэдка яны праяўляліся ў кур'ёзных сітуацыях. Ва ўспамінах П. Чарэвіна ўзгадваецца выпадак пры закрыцці кляштара візітак у Вільні: «Слаба асветлены касцёл; ціхая Імша; ксёндз ледзь чутна чытае малітву; манашкі ў голас плачуць на хорах [...] Карціна сапраўды была ўзрушальная. Нягледзячы на сур'ёзнасць сітуацыі, мы міжволі смяяліся пры абрадзе нішчэння – з'ядання – камунікантаў. Належыла за якую-небудзь гадзіну праглынуць ледзь не гадавы іх запас. Адна бляшанка змянялася другою, размочаныя аплаткі не так лёгка глыталіся»[16]. Своеасаблівы знак нязгоды з дзейнасцю ўлады выказалі манахі Варшаўскага бернардзінскага кляштара 12 кастрычніка 1864 г.: «...когда объявлено было о закрытии монастыря и предложено собраться в путь, они (монахи) не прониклись важностью минуты расставания с местом, где были принесены их торжественные обеты, но поспешили уничтожить имевшийся в монастыре запас вина, и через полчаса явились совершенно пьяными, едва держась на ногах и произнося слова, неприличные их духовному званию. Только несколько трезвых отличалось в толпе. Настоятель монастыря кс. Гавриил Вонсицкий не был в числе последних. Дойдя от опьянения до самого жалкого вида, он спрятался в тёмный угол боковой около рефектарской комнаты и не хотел выходить оттуда»[17]. У гэтым жа пратаколе палкоўнік Анунгін, які з'яўляўся пастаянным членам камісіі па закрыцці кляштараў у заходніх губернях, адзначаў паводзіны прадстаўнікоў розных каталіцкіх ордэнаў пры выкананні распараджэнняў ураду: «Капуцины неустанно молились, августинцы содействовали закрытию, доминикане выслушали объявление и чтение указа с полным спокойствием и покорностью, выражая при этом совершенную готовность исполнить волю правительства, кармелиты босыя – держали себя скромно и безропотно исполнили волю государя»[18]. У большасці сваёй духавенства разумела, што супраціўляцца ўладам бессэнсоўна – уступак не будзе. Тым не менш, некаторыя са святароў спрабавалі выказаць сваю пазіцыю. Пры закрыцці Кудзебскага касцёла ў Віцебскай губерні,

калі былі вынесены ўсе абразы, ксёндз Катарскі запаліў папяросу. Праваслаўны свяшчэннаслужыцель Аляксей Папоў заўважыў, што ў касцёле непрыстойна смаліць, ксендз жа адзеў шапку і выйшаў, але неадразу[19]. У падобнай сітуацыі вікарыя Чарнявецкага касцёла Ямпольскага павету Падольскай губерніі Кавальскага прыйшлося сілай выцягваць з канфесіяналу[20].

Вернікі рэдка прычыняліся да гэтай справы. Часцей за ўсё яны падавалі прашэнні з просьбай дазволіць функцыянаванне храма, абгрунтоўваючы такую неабходнасць далёкім месцазнаходжаннем наступнага касцёла ці капліцы і дрэнай камунікацыяй. Аднак ніводнае з прашэнняў не было задаволена.

Даволі выразна дэманстравалі сваё незадавальненне ўладальнікі асабістых сямейных капліц. Нямала клопатаў даставіла мясцоваму спраўніку апячатванне Францішкопальскай капліцы памешчыка Віцебскага павету Мартына Ульянаўскага, які быў пакараны грашовым спагнаннем за ўтрыманне антыўрадавай літаратуры. Гаспадар не даваў ключ некалькі разоў і тлумачыў свае дзеянні адстунасцю дома жонкі, ад якой патрабаваўся дазвол, бо ёй належыў маёнтак, дзе стаяла капліца. Затым М. Ульянаўскі сказаў, што дасць ключ пры ўмове, што ў капліцу не ўвойдзе праваслаўны святар Папоў. І апошняй, трэцяй спробай захаваць капліцу, было прашэнне пакінуць яе ўладальніку, бо там знаходзіўся сямейны склеп, пабудаваны 30 гадоў назад бацькам Мартына. Аднак нічога не атрымалася, а такое настойлівае супраціўленне выклікала сабой дадатковыя грашовыя спагнанні – 500 рублёў срэбра[21]. У пэўнай ступені наяўнасць такіх сітуацый падкрэслівае вернасць мясцовага насельніцтва гістарычным традыцыям рэгіёну і спецыфіку іх стаўлення да палітыкі ўраду Расійскай імперыі.

Больш актыўна праявілі сябе прадстаўнікі каталіцкай канфесіі пры пераводзе іх ў праваслаўе. Выказванне незадавальнення адбывалася рознымі спосабамі, што яскрава відаць з прасіцельнай дакументацыі і судовых спраў. Зразумела, каталіцкія святары не хацелі губляць сваіх вернікаў і дзейнічалі прапагандыскімі метадамі ў адмаўленні прымаць праваслаўе пры прамаўленні пропаведзей, на споведзі. Бывалі выпадкі парушэння выканання духоўных патрэбаў, ігнаравання ўрадавых распараджэнняў. Паліцэйскія справаздачы поўняцца выказваннямі тыпу «Римско-Католическое духовенство всеми мерами, в особенно на исповеди, старается внушать послушным своим прихожанам, что соединение с православными, названными ими схизматами, лишит их царства небесного. Кроме того, католическое духовенство запрещает католикам посещать православные храмы»[22]. З мэтай не дапусціць масавага пераходу ў праваслаўе ксяндзы наведвалі маёнткі і фальваркі. Так, у справе святара Тамковіча з Ігуменскага павету Мінскай губерні запісана: «...был в околице Беличанах у шляхтича Казимира Самотыги и убеждал его крепко держаться своей веры и не присоединяться до Православия»[23]. Той жа ксёндз па дарозе ў Белічаны затрымаў групу мясцовых шляхцічаў і заўзята раіў супрацівіцца пераводу ў праваслаўе словамі: «напинайте жилы как пружины»[24]. Падобнымі метадамі карыстаўся і плябан Анапольскага касцёла Ігуменскага павету Урбановіч. Ён падбухторваў сялян не хадзіць у праваслаўную царкву, пагражаў пракляццем Папы Рымскага і ўсяго рымска-каталіцкага духавенства. На запытанне сялян, як можна гэта не

рабіць, калі яны прынялі праваслаўе, ён адказваў, што «православное причастие не имеет никакой силы освящающей и что в этом смысле латинское причастие не сравненно превосходит»[25] . Сяляне зазначылі, што ў такім выпадку здзейсняць вялікі грэх, а ксёндз абяцаў узяць яго на сябе. Ксёндз Косаўскага касцёла Багдановіч, які выпадкова аказаўся на мызе памешчыка Тадэуша Юндзіла, хрысціў простай вадой усіх нарадзіўшыхся дзяцей, як ад змешаных шлюбаў, так і ад чыста каталіцкіх[26] . Яго дзеянні не зусім адпавядалі рэлігійным канонам, але дасягалі галоўнай мэты – любымі сродкамі павялічыць лік каталіцкіх вернікаў.

Парушэнні ў выкананні абрадава-культавых патрабаванняў былі ў той час даволі распаўсюджанай з’явай. Так, плябан Нягневіцкага касцёла Навагрудскага павету абвянчаў без папярэдняга запісу і на даму сына праваслаўнага свяшчэннаслужыцеля Івана Гарбацэвіча з дваранкаю каталіцкага веравызнання Елізаветаю Хмялеўскаю[27] . Мінскія каталіцкія святары ў знак пратэсту не дапускалі да прычасця каталічак, якія заключылі шлюб з рускімі чыноўнікамі, чым перасцярагалі будучых нявест ад змешаных шлюбаў[28] . Частка духавенства прымала на споведзь «новаправаслаўных», заклікала іх наведваць касцёлы, маліцца па лацінскіх малітоўніках. Некаторыя святары, адданыя справе прапагандзе рымска-каталіцкай веры, эксперыментавалі са сваёй рэлігійнай прыналежнасцю і рызыкавалі. Так, у 1866 г. ксёндз Ліпка Паразоўскага касцёла Гродзенскай губерні выказаў жаданне перайсці ў праваслаўе і заахвоціць усіх сваіх вернікаў. Аднак яго дзеянні былі скіраваны зусім у іншы бок. Атрымаўшы дазвол вольна перамяшчацца па Мінскай губерні, ён актыўна агітаваў не далучацца да праваслаўя. Зман быў раскрыты і ксяндза выслалі ў Архангельскую губерню[29] .

Важную ролю ў недапусканні простага насельніцтва прымаць праваслаўе займалі прадстаўнікі прывіліяваных саслоўяў. Гэта разумелі і мясцовыя чыноўнікі, якія галоўную прычыну адыходу ад праваслаўя бачылі ў дзейнасці паноў, што «на основании бывшего крепостного права, брали всегда в услужение крестьянских детей и постепенно приготовляли их к переходу»[30] . Патрыятычна настроеныя памешчыкі не проста адгаворвалі пераходзіць у праваслаўе, а нават забаранялі. Адныя пад прымусам працы забаранялі наведваць царкву. Другія адкрытымі пагрозамі не дапускалі хрышчэння дзяцей па праваслаўнаму абраду. Інтэсіўна праявіў сябе ў апошняй справе памешчык з Віцебскай губерні Іосіф Ульянаўскі. А яго маці Марыя, каб прадэманстраваць памылковасць дзеянняў сялян, што прынялі праваслаўе, на дзень сваіх імянін частвала гарэлкай толькі каталіцкую прыслугу[31] . Хаця сярод перайшоўшых у праваслаўе было дастакова шмат прадстаўнікоў з прывіліяваных саслоўяў, якім гарантаваліся розныя эканамічныя, матэрыяльныя і сацыяльныя заахвочванні.

Тут патрэбна адзначыць не апошняе месца сямейных традыцый і выхавання. Зразумела, што дзеці будуць падпарадкоўвацца волі бацькоў і прадаўжаць традыцыю канфесійнай прыналежнасці сям’і. Так, два вучні праваслаўнага веравызнання Кобрынскага прыходскага вучылішчы былі заўважаны ў касцёле. На допыце яны паказалі, што наведваюць касцёл па прымусу бацькі і апекуна, якія належаць да каталіцкай канфесіі[32] . Адна з вучаніц, якая паходзіла з заходніх губерняў і прыняла праваслаўе перад паступленнем у Беластоцкі інстытут

высакародных дзяўчын, «призналась одной классной даме, что мать ее Полька учила ее, когда она будет приобщаться, то чтобы причастие не глотала, а взявши в рот, когда никто не будет видеть, выплюнула, что она прежде и делала»[33].

Пераход у праваслаўе меў даволі масавы характар. За некалькі гадоў пасля падаўлення паўстання ў цэлым па Расійскай імперыі праваслаўнымі сталі больш за 80 тыс. каталікоў. Аднак гэтая з'ява не была стабільнай. Прасіцельная дакументацыя 1865–1867 гг. сведчыць пра тое, што «новаправаслаўныя» вернікі часта звярталіся з просьбай пакінуць іх у лацінстве, адзначаючы, што перавод быў прымусовы. Яны атрымоўвалі адказ з аргументацыяй іх былой уніяцкай рэлігійнай прыналежнасці ці паходжання ад змешаных каталіцка-праваслаўных шлюбаў. Так было з 70 вернікамі Селецкага касцёла Брэсцкага павету, з 13 жыхарамі аколіцы Ляжайкі Пружанскага павету і мястэчка Янава[34]. І гэта не адзінкавыя выпадкі. Некаторыя вернікі ў знак пратэсту прадаўжалі наведваць касцёл, другія ўвогуле адмаўляліся выконваць рэлігійныя абавязкі па любому з канфесійных абрадаў, трэція патрабавалі дазволу хадзіць на споведзь да ксяндза. Жыхары г. Драгічына, якія ў 1865 г. прынялі праваслаўе і ў тым жа годзе прасілі вярнуцца ў каталіцтва, часта наведвалі касцёл. На допыце патлумачылі свае ўчынкі тым, што «между другими Православными произошла молва, что после обедни зайти в Костел можно»[35]. Першапачатковых адгаворванняў было для іх мала, наведванне касцёла прадаўжалася. І толькі пагроза грашовых спагнанняў спыніла іх дзейнасць. У Шымкаўскай і Юшкаўскай валасцях Гродзенскай губерні пры патрабаванні ад сялян выканання святога абавязку праваслаўнага чалавека, хадзіць у царкву да споведзі прадстаўнікі мясцовай улады пачулі наступныя словы: «Пусть Начальство даст нам бумагу, что мы имеем право исповедоваться у ксендза в Порозовском костеле, то мы все сейчас же отправимся к исповеди»[36]. Дзяржаўных сялян Васілішскай воласці з вёскі Бакшты Гродзенскай губерні Мацвея Дарасевіча і Міхаіла Сідаровіча пакаралі ў прыклад другім сялянам высылкай у манастыр за абвестку, што «они православными быть не хотят и остаются католиками»[37]. Распаўсюджанымі былі выпадкі затрымання вернікаў у цэрквах з польскімі малітоўнікамі, якія выкарыстоўваліся імі на службе з-за няведання праваслаўных малітв.

Маюць месца таксама факты падтрымкі насельніцтвам пераходу ў праваслаўе. У некаторых мясцовасцях ён адбываўся цэлымі сем'ямі і нават прыходамі. Напрыклад, усе члены сям'і (у трох пакаленнях) дваранiна Ігнацыя Крушэўскага з Гродзеншчыны далучыліся да праваслаўнай веры[38]. У мястэчку Мікалаеўшчына Мінскай губерні праваслаўе прынялі ўсе рыма-каталікі (700 чалавек). Падобнае адбылося і ў мястэчках Беніцы, Валожыне Ашмянскага павету[39].

Такім чынам, дзяржаўная канфесійная палітыка 60-х гг. XIX ст. канцэнтравалася на арганізацыі сістэмы мерапрыемстваў па змяншэнню ўплыву Рымска-каталіцкай царквы ў заходніх губернях Расійскай імперыі. Не апошняе месца ў ёй адводзілася ліквідацыі духоўных устаноў і пераводу рознымі шляхамі веруючых-каталікоў у праваслаўе. Відавочна, што такія наступствы не маглі быць пакінуты без увагі мясцовымі каталіцкімі святарамі і вернікамі. Прыведзеныя прыклады не прэтэндуюць на інфармацыйную вычарпальнасць па праблеме,

але яскрава характарызуюць неадназначнасць і складанасць стаўлення мясцовага жыхарства да гістарычных падзей 60-х гг. XIX ст. У іх адносінах вылучаюцца тры вектары: а) маўклівае прыняцце адміністрацыйных распараджэнняў; б) падтрымка; в) супраціўленне. У большасці сваёй формы пратэсту і выказвання незадавальнення дзейнасцю ўлад насілі пасіўны характар. Яны ўключалі ў сябе як групавыя (у некаторых выпадках масавыя) віды, так і індывідуальныя. Сярод святарства папулярнымі аказаліся метады прапагандысцкай дзейнасці, вернікі ж абмяжоўваліся афіцыйнымі прашэннямі і адмаўленнямі выконваць рэлігійныя абавязкі па праваслаўнаму абраду. З дастаткова актыўным супраціўленнем з боку духавенства і вернікаў улады сутыкнуліся пры пераводзе каталікоў у праваслаўе. Тут асабліва цесна перапляталіся інтарэсы абедзвюх груп насельніцтва. Духавенства ўсе сілы сканцэнтравала на захаванні і павелічэнні колькасці каталікоў. Псіхалогія ж вернікаў была зарыентавана на прадаўжэнне традыцый бацькоў і дзядоў, а зламаць адразу тое, што будавалася вякамі, немагчыма. Складана прасачыць ступень інтэнсіўнасці і маштабнасці акцый адмаўлення прымаць праваслаўную веру, але іх наяўнасць дазваляе сцвярджаць свядомае нежаданне падпарадкоўвацца «чужому», навязанаму сілай элементу народнай культуры.

1 Миловидов А. И. Заслуги графа М. Н. Муравьева для православной церкви в Северо-Западном крае / Миловидов А. И. – Х.: Тип. Губ. правления, 1900. – С. 7.
2 Брянцев П. Д. Польский мятеж 1863 г. / Брянцев П. Д. – Вильно: Типография А. Г. Сыркина, 1892. – С. 144.
3 Владимиров А. П. История располячивания западнорусского Костела / Владимиров А. П. – М.: Губ. Тип., 1896; Миловидов А. И. Меры, принятые к ограждению православного населения от латино-польской пропаганды в Северо-Западном крае (Оттиск из Виленского календаря) / Миловидов А. И. – Вильна: Типография Вил. Прав. Св.-Духовского Братства, 1900; Чихачев Д. Н. Вопрос о располячивании Костела в прошлом и настоящем / Чихочев Д. Н. – Спб.: Т-ва А. С. Суворина, 1913.
4 Граф Михаил Николаевич Муравьев. Записки его об управлении Северо-Западным краем и об усмирении в нем мятежа, 1863–1866 гг. – СПб. – С. 396.
5 Зайцев В. М. Социальный состав участников восстания 1863 г. (опыт статистического анализа) / Зайцев В. М. – М.: Наука, 1973; Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии: сб. документов / редкол.: В. Дьяков (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1965.
6 Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / [В. В. Грыгор'ева, М. У. Завальнюк, У. І. Навіцкі, А. М. Філатава]; навук. рэд. У. І. Навіцкага. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1998; Морозько Е. В. Изменение религиозной ситуации на Пинщине после восстания 1863–1864 гг. / Морозько Е. В. // Национализм и конвенция гражданского общества в Восточной Европе / под общ. ред. М. Э. Чесновского. – Брест: БрГУ, 2009. – С. 236–243; Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на літоўскіх і беларускіх землях / Алесь Смалянчук. – 2-е выд., дапрац. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004; Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў грамадскім і палітычным жыцці Беларусі ў 1861–1914 гг. / Валянціна Яноўская. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 2002.
7 Fajnzhauz D. 1863: Litwa i Białoruś / Fajnzhauz D. – Warszawa: Neriton, 1999; Niebelski E. Nieprzejednanie wrogowi Rosji. Duchowenstwo Lubelski i Podlaskie w powstaniu 1863 roku i na zeslaniu / Niebelski E. – 2-e wyd. zmienione i poprawione. – Lublin: Wydawnictwo KUL, 2008.

8 Історія релігії в Україні: у 10 т. / Редкол.: А. Колодний (голова) та ін. – К., 2001. – Т. 4: Католицизм / За ред. П. Яроцького.
9 Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / Комзолова А. А. – М.: Наука, 2005; Долбилов М. Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / Долбилов М. – М.: Новое литературное обозрение, 2010.
10 Долбилов М., Сталюнас Д. Обратная уния: проект присоединения католиков к православной церкви в Российской империи (1865–1866 годы) / Долбилов М., Сталюнас Д. // Славяноведение. – 2005. – № 5. – С. 8–14.
11 Історія релігії в Україні... – Т. 4. – С. 93.
12 Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў грамадскім і палітычным жыцці Беларусі ў 1861 – 1914 гг. / Валянціна Яноўская. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 2002. – С. 126.
13 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі г. Мінск (далей – НГАБМ). – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1899. – Арк. 12.
14 Там жа. – Спр. 1638.
15 Нацыянальны гістарычны архіў г. Гродна (далей – НГАБГ). – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 616.
16 Вайна супраць народа і касцёла. Пра «успаміны» царскага генерала аб падзеях 1863–1865 гг. у Беларусі і Літве // Наша вера. – 1998. – № 2. – С. 51.
17 Biblioteka Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego Jana Pawła II. – Zbiory ks. B. Ussasa. – Rkps 748. – K. 38.
18 Ibid.
19 НГАБМ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31946.
20 Там жа. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1671.
21 Там жа. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31946.
22 Там жа. – Ф. 3046. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 290.
23 Там жа. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1763. – Арк. 1.
24 Там жа. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1763. – Арк. 1.
25 Там жа. – Ф. 296. – Воп. 1. – Спр. 130.
26 НГАБГ. – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 1127.
27 НГАБМ. – Ф. 531. – Воп. 2. – Спр. 1315.
28 Там жа. – Ф. 296. – Воп. 1. – Спр. 20
29 Там жа. – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 821.
30 Там жа. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31694. – Арк. 2.
31 Там жа. – Спр. 31946.
32 Там жа. – Спр. 630.
33 Там жа. – Спр. 712. – Арк. 1.
34 Там жа. – Спр. 380.
35 Там жа. – Спр. 626. – Арк. 17.
36 Там жа. – Спр. 821. – Арк. 8.
37 Там жа. – Спр. 1152.
38 Там жа. – Спр. 380.
39 Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў грамадскім і палітычным жыцці Беларусі ў 1861–1914 гг. / Валянціна Яноўская. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 2002. – С. 20.

**SAMMARY**

**Alena Firynovich**

Catholics' Attitudes to Confessional Policies of Russian Imperial Government in 1860ies
The relationships between Catholic clergy and believers in Western provinces of Russian Empire during and after 1863–1864 resurrection are analyzed in the article The reaction of local inhabitants to the closure of catholic churches and monasteries is described.